# 11 клас

## 1 тур

**Максімальная колькасць балаў – 204**

## I. Уважліва прачытайце і знайдзіце памылкі ў тэксце, напішыце правільны адказ.

**За ўсе выкананыя заданні – 13 балаў (за кожны правільны адказ 1 бал)**

Вясной – летам 1917 г. ва ўмовах нядзольнасці Петраградскага Савету вырашыць пытанні аб зямлі, вайне і міры ў Расіі нарастаў палітычны і эканамічны крызіс. У гэтай сітуацыі яго палітычным праціўнікам стаў Бунд на чале з У. І. Леніным. Па яго ініцыятыве быў распрацаваны курс на заваёву ўлады праз узброенае паўстанне з мэтай звяржэння ўрада. Па нацыянальным пытанні бундаўцы прызнавалі права нацый на самавызначэнне аж да стварэння імі самастойнай дзяржавы. 25 кастрычніка (7 лістапада паводле новага стылю) 1918 г. рабочыя Петраграда і рэвалюцыйна настроеныя салдаты звергі ўладу буржуазнага Петраградскага Савета. 26 кастрычніка Часовы ўрад абвесціў савецкую ўладу ў цэнтры і на месцах. Былі прыняты гістарычныя Дэкрэты аб міры і зямлі. Прапаноўвалася неадкладна пачаць перамовы з краінамі, якія ваявалі, аб справядлівым і дэмакратычным міры з выплатай кантрыбуцыі. Скасоўвалася памешчыцкая ўласнасць на зямлю без усялякага выкупу. З'езд утварыў Часовы рабоча-сялянскі ўрад – Савет Народных Камісараў (СНК) на чале з Л. Д. Троцкім . У выніку кастрычніцкіх падзей 1917 г. адбыўся пераход улады да Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх дэпутатаў, што стала пачаткам Лютаўскай рэвалюцыі. 25 кастрычніка бальшавікі Мінска атрымалі паведамленне аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у якім пераважалі эсэры, абвясціў сваю ўладу ў горадзе. Па яго ўказанні з турмы былі вызвалены салдаты, арыштаваныя за выступленні супраць Часовага ўрада. З іх быў арганізаваны Першы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета. Процідзеянне Мінскаму Савету аказаў Камітэт Заходніх губерній. Ён быў створаны з мэтай захавання ўлады Часовага ўрада ў перыяд Кастрычніцкага ўзброенага паўстання 1917 г. Камітэт патрабаваў перадачы яму ўлады ў горадзе і прыняў рашэнне аб увядзенні ў Мінск Каўказскай кавалерыйскай дывізіі. Перавага сіл у гэты момант аказалася на баку Камітэта. Мінскі Савет пайшоў на перамовы з Камітэтам. Аднак, калі ў Мінск прыбылі пабальшавіцку настроеныя войскі і браніраваны цягнік з Заходняга фронту, суадносіны сіл змяніліся на карысць эсэраў. 22 лістапада 1917 г. уладу ў Мінску канчаткова ўзяў у свае рукі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняй вобласці і фронту.

**Адказ:**

Вясной – летам 1917 г. ва ўмовах нядольнасці Петраградскага Савету **1. (Часовага ўрада)** вырашыць пытанні аб зямлі, вайне і міры ў Расіі нарастаў палітычны і эканамічны крызіс. У гэтай сітуацыі яго палітычным праціўнікам стаў Бунд **(стала Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (бальшавікоў)** – на чале з У. І. Леніным. Па яго ініцыятыве быў распрацаваны курс на заваёву ўлады праз узброенае паўстанне з мэтай звяржэння ўрада. Па нацыянальным пытанні бундаўцы **(РСДРП(б) / бальшавікі)** прызнавалі права нацый на самавызначэнне аж да стварэння імі самастойнай дзяржавы. 25 кастрычніка (7 лістапада паводле новага стылю) 1918 г.**(1917 г.)** рабочыя Петраграда і рэвалюцыйна настроеныя салдаты зверглі ўладу буржуазнага Петраградскага Савета **(Часовага ўрада)**. 26 кастрычніка Часовы ўрад **(ІІ Усерасійскі з’езд Саветаў)** абвесціў савецкую ўладу ў цэнтры і на месцах. Былі прыняты гістарычныя Дэкрэты аб міры і зямлі. Прапаноўвалася неадкладна пачаць перамовы з краінамі, якія ваявалі, аб справядлівым і дэмакратычным міры з выплатай кантрыбуцыі **(без анексій і кантрыбуцый).** Скасоўвалася памешчыцкая ўласнасць на зямлю без усялякага выкупу. З’езд утварыў Часовы рабоча-сялянскі ўрад – Савет Народных Камісараў (СНК) на чале з Л. Д. Троцкім **(У. І. Леніным)** . У выніку кастрычніцкіх падзей 1917 г. адбыўся пераход улады да Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх дэпутатаў, што стала пачаткам Лютаўскай рэвалюцыі **(Кастрычніцкай рэвалюцыі)**. 25 кастрычніка бальшавікі Мінска атрымалі паведамленне аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у якім пераважалі эсэры **(бальшавікі)**, абвясціў сваю ўладу ў горадзе. Па яго ўказанні з турмы былі вызвалены салдаты, арыштаваныя за выступленні супраць Часовага ўрада. З іх быў арганізаваны Першы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета. Процідзеянне Мінскаму Савету аказаў Камітэт Заходніх губерній **(Камітэт выратавання рэвалюцыі).** Ён быў створаны з мэтай захавання ўлады Часовага ўрада ў перыяд Кастрычніцкага ўзброенага паўстання 1917 г. Камітэт патрабаваў перадачы яму ўлады ў горадзе і прыняў рашэнне аб увядзенні ў Мінск Каўказскай кавалерыйскай дывізіі. Перавага сіл у гэты момант аказалася на баку Камітэта. Мінскі Савет пайшоў на перамовы з Камітэтам. Аднак, калі ў Мінск прыбылі па-бальшавіцку настроеныя войскі і браніраваны цягнік з Заходняга фронту, суадносіны сіл змяніліся на карысць эсэраў **(бальшавікоў)**. 22 лістапада **(2 лістапада)** 1917 г. уладу ў Мінску канчаткова ўзяў у свае рукі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняй вобласці і фронту.

## II. Уважліва вывучыце дакумент і адкажыце на пытанні (26 балаў).

Прынята ў Варшаве ….

Мы, рады каронныя, духоўныя і свецкія, і рыцарства, і станы іншыя адзінай і …. Абвяшчаем усім, каму належыць, на вечную той справы памяць, што ў той небяспечны час без караля, пана вярхоўнага, жывучы, намагаліся пільна таго на з’ездзе Варшаўскім, каб па прыкладзе продкаў нашых самі між сабой пакой, справядлівасць і парадак і абарону …утрымаць і захаваць маглі. Аб тым адзінадушным рашэннем і святою прысягаю сабе гэта ўсе супольна імем усёй … абяцаем і бяром абавязак верай, годнасцю і сумленнем нашым наперад аніякага падзелу між сабой не чыніць, ані раздзялення якога не дапусціць, як у адной непадзельнай … ніводная частка без іншай ані гаспадара сабе абіраць, ані змовы асобнай з іншымі не чыніць, але адпаведна з месцам і часам вызначаным, з’ехацца ўсёй грамадой кароннай і супольна і спакойна тую справу абрання гаспадара па волі Божай слушна разгледзець, а інакш на гаспадара не згаджацца, адно толькі як з такой і менавітай умоваю, што нам перш правы ўсе, прывілеі і вольнасці нашыя, якія ёсць і якія яму надамо па абранні, нам прысягнуць мусіць. А менавіта гэта прысягнуць: пакой паспаліты між людзьмі рознае веры і набажэнства захоўваць і нас за мяжу Кароны ніколі ні ў які спосаб не цягнуць, ані просьбаю каралеўскаю сваёй, ані выплатай пяці грыўнаў на дрэўца, ані рушэння паспалітага без згоды соймавае чыніць. Таму паўстаць супраць кожнага такога абяцаем, хто б альбо месца і час іншы для выбараў гаспадара сабе прызначаў, або замяшанне на выбарах чыніць хацеў, альбо люд служэбны асабліва наймаў, альбо выбарам гэтым, са згоды супольнай праведзеным, супрацiўляцца асмеліўся. А як у … ёсць розніца немалая з боку веры хрысціянскай, папярэджваючы тое, каб з той прычыны між людзьмі сваркі якія шкадлівыя не пачаліся, каторыя па іншых каралеўствах ясна бачым, абяцаем тое сабе супольна за нас і за патомкаў нашых на вечныя часы пад прысягай з вераю, годнасцю і сумленнем нашым, што розныя ў веры пакой між сабой захаваюць, а з-за рознай веры і адрозненняў у касцёлах крыві не праліваць, ані з-за гэтага караць асуджэннем маёмасці, знявагаю, заключэннем у вязніцу, выгнаннем не будуць, і ніводнаму верхавенству ані ўраду да такога ўчынку ніводным спосабам не дапамагаць, і наадварот, дзе б яе хто праліваць хацеў, з той прычыны будзем бараніцца, у тым усе будзем абавязаныя, хаця б тое пад страхам асуджэння або справы якой судовай хто б тое ўчыніць хацеў. Бо цераз тую канфэдэрацыю нашаю аніякай улады над падданымі іх, як станаў духоўных, так і свецкіх, панам іхнім не адмаўляем. І калі б такое свавольства дзе адбылося пад відам набажэнства, як заўсёды было, будзе вольна і цяпер кожнаму пану падданага свайго непаслухмянага як у духоўных, так і ў свецкіх рэчах, паводле разумення свайго пакараць, каб усе наданні верхавенства і ўлады каралеўскай царкоўныя пасады такія, як арцыбіскупства, біскупства і іншая ўсялякая маёмасць была даваная не іншым, як адно толькі рымскага касцёлу асобам духоўным, жыхарам польскім паводле Статуту. А маёмасць касцёлаў грэцкіх людзям той жа грэцкай веры мусіць быць дадзена. А як пакой

нямала ад таго залежыць, каб супярэчанні паміж рознымі станамі былі стрыманыя, а між станамі духоўным і свецкім ёсць немалая розніца ў рэчах свецкіх дачасных мінаючых, абяцаем усё тое між сабою зраўняць на бліжэйшым сойме па абранню гаспадара. Справядлівасці парадку такому моц надаём, які сабе каторае ваяводства супольна пастанавіла альбо яшчэ пастановіць у згодзе. Таксама і аб абароне патрэбнае замкаў пагранічных, хто-кольвек каму пэўны доўг запісаў і дабравольна згадзіўся сваім запісам адказваць перад замкавым судом, ці будзе гэта перад смерцю або ўжо пасля смерці караля, такі кожны паводле запісу свайго няхай звыклыя наступствы права церпіць.

А панове старастове будуць павінныя моцаю таго паспалітага абавязку без усякае валакіты паводле звычаю судзіць і разбіраць і паспяхова выконваць такія справы, акрамя тых ваяводстваў, каторыя сабе кшталт або звычай справядлівасці спаўнення асаблівы пастанавілі ў час бескаралеўя альбо яшчэ пастанавіць маюць. Запісы ўсялякія і наданні маёмасці вечныя перад кнігамі ўчыненыя і каторыя надалей будуць учынены падчас бескаралеўя супольным на тое канфэдэрацыі дазволам пастанаўляем, каб падчас бескаралеўя, пачаўшы з дня смерці караля, нікому ва ўчынках законных даўнасць земская не шкодзіла на будучае да справядлівасці яго. Таксама тыя, каторыя мелі ў час пэўны пазыкі грошай на мінулыя гады або год новы, або на які час ужо мінулы, – тыя ўсе будуць абавязаныя атрымаць свае грошы на першых судах, дасць Бог па абранні новага караля альбо на першае адкрыццё судовых кніг. Абяцаем таксама тое сабе, што на выбары караля прызначаныя едучы і на месцы будучы і да дому з'язджаючы, гвалту ніякага людзям і паміж сабой чыніць не будзем. Тыя ўсе рэчы абяцаем самі разам з нашчадкамі сваімі захоўваць няўхільна і трымаць пад вераю, годнасцю і сумленнем нашым. А хто б таму супраціўляўся і пакой ды парадак паспаліты псаваў, супраць такога ўсе паўстанем на яго парушэнні. А для лепшай пэўнасці ўсіх тых апісаных рэчаў прылажылі мы пячаткі свае да гэтага і рукамі ўласнымі падпісалі…

**1. Як называецца гэты дакумент? Калі і ў якой краіне ён быў прыняты? (3 балы)**

**2. Што характэрна для палітычнай сітуацыі ў гэтай краіне ў час прыняцця гэтага дакумента. Якія пазіцыі па гэтаму пытанню займалі розныя канфесійныя групы? (4 балы)**

**3. Дакажыце словамі дакумента, што ён прадугледжваў свабоду веравызнання ў гэтай краіне. (5 балаў)**

**4. У чым было значэнне прыняцця гэтага дакумента? (2 балы)**

**5. Як вырашалася канфесійнае пытанне ў гэты час ў Францыі, Швецыі, Англіі? (6 балаў)**

**6. Выкажыце сваё меркаванне аб тым, які шлях вырашэння рэлігійных пытання з'яўляецца найбольш прымальным. (да 6 балаў)**

**Адказ:**

**1.** Акт Варшаўскай канфедэрацыі аб свабодзе веравызнанняў прыняты у Рэчы Паспалітай 28 студзеня 1573 г.

**2.** У 1572 г. памёр Жыгімонт ІІ Аўгуст. На ім спынілася дынастыя Ягелонаў. Пачаліся пошук і выбары манарха. Генрых Валуа будзе каранаваны ў 1574 годзе. Варшаўская канфедэрацыя мела мэтай пераадолець праблемы, якія ўзніклі пасля заключэння Люблінскай уніі, і ўтварэння Рэчы Паспалітай, якая мела адзінага караля (а ў той момант не мела і яго), але не мела агульнай царквы. І калі ў Польшчы дамінавалі каталікі, то рэлігійная палітра ВКЛ была даволі стракатай. На ўсходніх землях пераважала праваслаўныя, на заходніх – каталіцызм. На поўначы і захадзе распаўсюджваліся ідэі Рэфармацыі. З часоў Вітаўта ў ВКЛ пражывала вялікая іудзейская абшчына. Для таго, каб акт Варшаўскай канфедэрацыі атрымаў сілу закона, неабходна было, каб яго пацвердзіў кароль. Улічваючы, што Генрых Валуа і яго маці Кацярына Медычы праславіліся “Варфаламееская ноччу” – гэта было няпроста. Усе біскупы, акрамя кракаўскага Францыска Красінскага, былі супраць прыняцця акта канфедэрацыі і рэлігійных свабодаў. І калі каталікі святкавалі з нагоды выбрання Генрыха Валуа, дысыдэнты, у ліку якіх быў кіеўскі ваявода Астрожскі (сын вялікага гетмана Канстанціна Астрожскага) з праваслаўнай шляхтай, пакінулі залю абрання. Міжусобіцы пагражала кровапраліццем. І праціўнікі прыйшлі да кампрамісу: дысыдэнты пагадзіліся на абранне Генрыха, а каталікі прынялі цалкам Генрыкавы артыкулы. На сойме 20 мая 1573 года “Артыкулы” падпісаў прадстаўнік новаабранага караля Генрыха Валуа.

**3.**

**1**. **“**абяцаем і бяром абавязак верай, годнасцю і сумленнем нашым наперад аніякага падзелу між сабой не чыніць, ані раздзялення якога не дапусціць, як у адной непадзельнай … ніводная частка без іншай ані гаспадара сабе абіраць, ані змовы асобнай з іншымі не чыніць, але адпаведна з месцам і часам вызначаным, з’ехацца ўсёй грамадой кароннай і супольна і спакойна тую справу абрання гаспадара па волі Божай слушна разгледзець**”** – **1 бал**,

**2.** “пакой паспаліты між людзьмі рознае веры і набажэнства захоўваць” – **1 бал**.

**3.** “абяцаем тое сабе супольна за нас і за патомкаў нашых на вечныя часы пад прысягай з вераю, годнасцю і сумленнем нашым, што розныя ў веры пакой між сабой захаваюць, а з-за рознай веры і адрозненняў у касцёлах крыві не праліваць, ані з-за гэтага караць асуджэннем маёмасці, знявагаю, заключэннем у вязніцу, выгнаннем не будуць, і ніводнаму верхавенству ані ўраду да такога ўчынку ніводным спосабам не дапамагаць, і наадварот, дзе б яе хто праліваць хацеў, з той прычыны будзем бараніцца, у тым усе будзем абавязаныя, хаця б тое пад страхам асуджэння або справы якой судовай хто б тое ўчыніць хацеў” – **1 бал**.

**4.** “І калі б такое свавольства дзе адбылося пад відам набажэнства, як заўсёды было, будзе вольна і цяпер кожнаму пану падданага свайго непаслухмянага як у духоўных, так і ў свецкіх рэчах, паводле разумення свайго пакараць, каб усе наданні верхавенства і ўлады каралеўскай царкоўныя пасады такія, як арцыбіскупства, біскупства і іншая ўсялякая маёмасць была даваная не іншым, як адно толькі рымскага касцёлу асобам духоўным, жыхарам польскім паводле Статуту” – **1 бал**.

**5.** “А маёмасць касцёлаў грэцкіх людзям той жа грэцкай веры мусіць быць дадзена. А як пакой нямала ад таго залежыць, каб супярэчанні паміж markрознымі станамі былі стрыманыя, а між станамі духоўным і свецкім ёсць немалая розніца ў рэчах свецкіх дачасных мінаючых, абяцаем усё тое між сабою зраўняць на бліжэйшым сойме па абранню гаспадара” – **1 бал**.

**4.** Акт варшаўскай канфедэрацыі з'яўляецца першым такім дакументам у Еўропе. Хоць акт і не прадухіліў усіх канфліктаў на аснове рэлігіі, аднак зрабіў Рэч Паспалітую нашмат больш бяспечным і талерантным месцам, чым вялікая частка Еўропы, дзе ў той час бушавалі рэлігійныя войны – **2 балы**.

**5.** У другой палове XVI ст., калі ў **Францыі** ўспыхнулі рэлігійныя вайны, зноў сталі збірацца Генеральныя штаты, на якіх і пратэстанты, і каталікі прапаведавалі ідэю народнага вяршэнства і імкнуліся цалкам падпарадкаваць каралеўскую ўладу штатам. У снежні 1560 г. памёр Францыск II. На пасаду уступіў брат нябожчыка-караля Карл IX, дзесяцігадовы хлопчык. Рэгенткай пры малалетнім каралю была яго маці каралева Кацярына Медычы, якая дзяліла ўладу з Антуанам Бурбонам. Барацьба пры двары прыняла жорсткія формы. Грамадзянскія вайны ў Францыі доўжыліся з 1559 г. па 1598 г. У цэлым гісторыю грамадзянскіх войнаў у Францыі можна разбіць на тры перыяды, вызначаных наступнымі рубяжамі:

1) Варфаламееўскай ноччу (1572 г.);

2) стварэннем Каталіцкай лігі (1576 г.);

**3)** Нантскім эдыктам (1598 г.) – **2 балы.**

**4) Англія.** У 1553 г. каралевай стала дачка Генрыха VIII і Кацярыны Арагонскай Марыя (1553–1558), фанатычная каталічка, якая ўступіла ў шлюб з такім жа фанатыкам Філіпам II Іспанскім, сынам Карла V. Паслухмяны парламент адмяніў пры ёй усе рэформы ў царкве і аднавіў папскую ўладу ў Англіі. Але Марыі не ўдалося вярнуць манастырам маёмасць, якая была раздадзена раней новым уладальнікам. Каралева аднавіла пакаранне за веру. За сваю жорсткасць Марыя нават атрымала назву Крывавай. Калі яна памерла, каралевай стала іншая дачка Генрыха VIII (ад Ганны Болейн) Елізавета (1558–1603). Новая каралева ў глыбіні душы была больш каталічкай, чым пратэстанткай, але яе становішча прымусіла абараняць Рэфармацыю. Католікі не прызнавалі законнасць шлюбу яе маці з Генрыхам

VIII, а таму адкідалі і яе права на трон. Пасля уваходжання на трон Елізавета з дапамогай парламенцкіх актаў аднавіла англіканскую царкву ў тым выглядзе, які апошняя атрымала пры Эдуардзе VI. Адмовіўшыся, як жанчына, ад іерархічнага тытула “кіраўніка царквы”, яна прыняла тытул “вярхоўнай кіраўніцы царкоўных і свецкіх спраў”, яна прыняла раўнасільны тытул “вярхоўнай кіраўніцы царкоўных і свецкіх спраў”. “Акт аб аднастайнасці”, выдадзены парламентам, прадпісваў здзяйсняць набажэнства па новым англійскім Трэбніку. Усё веравучэнне англіканскай царквы, выкладзенае ў “39 артыкулах веры”, таксама было зацверджана парламентам. У такім выглядзе англіканская царква захоўваецца і да гэтага часу – **2 балы.**

**Швецыя** Рэформа Касцёла ў Швецыі ажыццяўлялася паступова. З 1525 г. пачалося правядзенне набажэнстваў на шведскай мове, у 1526 г. быў выдадзены Новы Запавет, а ў 1541 г. – уся Біблія, і кароль абавязаў усе цэрквы купіць новыя кнігі. У 1527 г. на Вестеросскім рыксдазе кіраўніком Царквы быў абвешчаны кароль, а маёмасць манастыроў было канфіскавана на карысць кароны. Справамі Царквы сталі кіраваць свецкія асобы, прызначаныя каралём. У 1536 г. у Упсальскі замку адбыўся Царкоўны сабор, на якім лютэранскія царкоўныя кнігі былі прызнаныя абавязковымі для ўсёй Швецыі. Цэлібат быў адменены. У 1571 г. Лаўрэнцiя Петры быў распрацаваны “Шведскі царкоўны статут”, у якім вызначалася арганізацыйная структура і характар самакіраванай Шведскай Царквы. Пастары і свецкія атрымлівалі магчымасць выбіраць біскупаў, аднак канчатковае зацвярджэнне кандыдатаў стала прэрагатывай караля. Разам з тым з прычыны адсутнасці жорскага супрацьстаяння паміж рымскімі каталікамі і прыхільнікамі Рэфармацыі, які меў месца ў краінах Цэнтральнай Еўропы, адрозненні ў вонкавым характары набажэнстваў рэфармаванай і Рымска-каталіцкай царквы былі мінімальныя. Таму шведскі абрад прынята лічыць узорам царкоўнай традыцыі ў лютэранстве – **2 балы.**

**III. Уважліва паглядзіце на карту і адкажыце на пытанні. (Поўны адказ – 13 балаў).**




**1. Да гісторыі якой краіны адносіцца карта? (1 бал)**

**2. Якая краіна пазначана на карце фіялетавым колерам? Да якога года яна займала гэтую тэрыторыю? (2 бал)**

**3. Хто стаў пераемнікам Філіпа II?(1 бал)**

**4. Што пазначана ружовым колерам на прадстаўленай карце? Калі гэты пераемнік пачаў свае паходы і колькі год у яго гэта заняло? (3 балы)**

**5. Якую назву атрымаў вынік узаемадзеяння культур, які ўзнік у выніку заваёўванняў? Даце яму характарыстыку (3 балы)**

**6. Ахарактарызуйце форму палітычнага ладу створаных дзяржаў (3 балы)**

**Адказ:**

1. Да гісторыі Македонскага царства. **(1 бал)**
2. Гэта Македонскае царства да 336 г. д.н.э. **(2 балы)**
3. Яго пераемнікам стаў сын Аляксандр.**(1 бал)**
4. У 334 г. да н. э. ён пачаў паход супраць Персідскай імперыі. За 10 гадоў былі заваяваныя вялізныя тэрыторыі ад Егіпта да Індыі. **(3 балы)**
5. Сілай зброі Аляксандр стварыў велізарную дзяржаву, у якую ўвайшло мноства народаў з рознымі старажытнымі культурамі, рэлігіямі, ладам жыцця. Традыцыі ўсходняй дэспатыі перапляліся з ідэаламі поліснай дэмакратыі, а культура даўнейшых цывілізацый Старажытнага Усходу – з грэчаскімі рацыянальнымі ідэямі. Зліццё культур паўплывала і на Аляксандра Македонскага: усё часцей ён паводзіў сябе як усходні ўладар, патрабаваў усеагульнага пакланення, пры яго двары ўсталяваўся ўсходні цырыманіял, пачалося абагаўленне Аляксандра. Перыяд узаемадзеяння культур атрымаў назву “элінізм” і стаў важным этапам у развіцці народаў Усходняга Міжземнамор’я і Пярэдняй Азіі. Пасля смерці Аляксандра Македонскага склалася каля дзясятка вялікіх і малых дзяржаў, якія гісторыкі аб’ядналі паняццем “эліністычныя дзяржавы” **(3 балы).**
6. Формай палітычнага ладу эліністычных дзяржаў была манархія, у якой спалучаліся традыцыйныя для Старажытнага Усходу дэспатычныя формы дзяржаўнай арганізацыі і кіравання з элементамі грэчаскага (поліснага) уладкавання і грамадска-палітычнага жыцця. Пануючы слой насельніцтва ў іх складалі грэка-македонскія заваёўнікі, а таксама мясцовая знаць, якая прыняла грэчаскую культуру. У гарадах грэчаскае насельніцтва збіралася на народныя сходы, аднак разам з тым грэчаскія цары абагаўляліся на ўсходні лад, мелі тытулы старажытнаўсходніх уладароў **(3 балы).**

**IV. Дапоўніце элементы схемы і адкажыце на пытанні. (Поўны адказ 11 балаў).**




Дзяржаўныя органы ўлады ў Францыі ў перыяд абсалютызму

**1. Да гісторыі якой краіны тычыцца гэтая схема? Запоўніце схему. (5 балаў)**

**2. Які перыяд гісторыі гэтай краіны адлюстроўвае гэтая схема? (1 бал)**

**3. Хто з гістарычных дзеячаў гэтай краіны падрыхтаваў глебу для такой формы дзяржаўнага ладу? (2 балы)**

**4. Назавіце імя і гады кіравання кіраўніка гэтай дзяржавы, калі прыведзеная ў схеме сістэма кіравання праявілася найбольш яскрава? (2 балы)**

**5. Які будынак у гэтай краіне стаў сімвалам велічы ўлады манарха? (1 бал)**

**Адказ:**

**1.** Гэтая схема датычыцца гісторыі Францыі. Кожны правільны адказ у схеме – 1 бал

**2.** Перыяд абсалютызму.

**3.** Глебу для французскага абсалютызму падрыхтавалі сваёй дзейнасцю кардынал Рышэлье (з’яўляючыся першым міністрам з 1624 г. ён аслабіў пазіцыі арыстакратыі і незалежных пратэстанцкіх марадоў) і міністр Жан Батыст Кальбер (вёў палітыку, накіраваную на ўмацаванне ўнутранай эканомікі і яе абарону ад канкурэнцыі тавараў з іншых дзяржаў).

**4.** Найбольш яскравы прыклад абсалютызму – Францыя перыяду кіравання караля Людовіка XIV (1643–1715 гг.). Ваенныя поспехі Францыі, даходы ад заморскіх уладанняў, асабліва ад плантацый цукровага трыснягу з французскіх калоній Карыбскага мора, стварылі неабходную матэрыяльную базу для неабмежаванай улады манарха. Раскоша

французскага двара стала сімвалам поспеху кіравання дзяржавай і ўзорам для пераймання.

5. Яшчэ адным сімвалам велічы ўлады манарха стала будаўніцтва шыкоўнага палаца – Версаля.

**V. Уважліва паглядзіце на карціны і адкажыце на пытанні. (Поўны адказ – 30 балаў)**

<table>
<tr><td>1.<br>
</td><td>2.<br></td></tr>
<tr><td colspan="2">3.<br></td></tr>
<tr><td colspan="2"></td></tr>
</table>

**4.**



1. **Назавіце асобу, якая пазначана нумарам 1. Назавіце гады яго кіравання ў Рэчы Паспалітай. (2 балы)**
2. **Якія гістарычныя падзеі другой паловы XVI ст. адлюстраваны на карцінах пад нумарам 2 і 3? (4 балы)**
3. **На карціне пад нумарам 3 мастак у цэнтры размясціў рэлігійнага дзеяча. Назавіце яго імя і растлумачце яго цэнтральнае месца на карціне (6 балаў).**
4. **Да якіх гістарычных наступстваў прывялі падзеі, адлюстраваныя на карціне пад нумарам 3? (2 балы)**
5. **Назавіце умовы падпісанай дамовы (4 балы)**
6. **Ахарактарызуйце дзейнасць манарха, адлюстраванага на карціне пад нумарам 1. (6 балаў)**
7. **У якім горадзе знаходзіцца замак, прадстаўлены на малюнке пад нумарам 4? Якое дачыненне гэты замак мае да асобы, прадстаўленай на карціне пад нумарам 1? Што гэтая асоба зрабіла для гэтага горада? (6 балаў)**

**Адказ:**

**1.** Стэфан Баторый, вялікі князь літоўскі, кароль польскі ў 1576-1586 гг. **(2 балы).**

**2.** Пад нумарам 2 – асада Стэфанам Баторыем Пскова ў 1581 г.

Пад нумарам 3 – Стэфан Баторый пад Псковам (эпізод Лівонскай вайны): пасольства рускага цара Івана IV Грознага да вялікага князя літоўскага і караля польскага Стэфана Баторыя з просьбай аб міры **(4 балы).**

**3.** У цэнтры кампазіцыі змесцавана выразная фігура езуіта Антоніа Пасевіна – папскага легата і пасла да Івана IV. Становішча рук Пасевіна як бы сімвалізуе складанасць яго дыпламатычнай і міратворчай місіі. Адна рука працягнута да Баторыя, іншая робіць ахавальны жэст у дачыненні ўладыкі Кіпрыяна. Пасевіна пры спрыянні езуітаў прыкладаў немалыя высілкі для пашырэння ў Расіі ўплыву Ватыкана. Уся кампазіцыя карціны пабудавана вакол Пасевіна, а не Баторыя. Езуіт Антоніа Пасевіна сапраўды адыграў важную ролю ў гэтых гістарычных падзеях – ён прыбыў пад абложаны Пскоў, Баторый з’ехаў з-пад абложанага горада з часткай войска, а пасярэдніцтва Пасевіна сапраўды прывяло да складання міру **(6 балаў).**

**4.** Гэтыя падзеі прывялі да падпісання перамір’я паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай у Ям-Запольле ў 1582 г. і выйсця РП з Лівонскай вайны. **(2 балы).**

**5.** а) Іван Грозны адмаўляўся ад наступных гарадоў Лівоніі з усёй маёмасцю, ім прыналежным, і з валасцямі пры гэтых крэпасцях: Аліст, Борзун, Вельян, Валадзімерац, Гоўя, Дынабург, Дэрпт, Карслаў, Каўлец, Керепець, Кокенхаўзен, Кангот, Круцборг, Лаіс, Лаўдун, Лiневард, Мукаў, Наўгародак Лівонскі, Пайдэ, Пярноў новы, Пярноў стары, Полчаў, Рандек, Рінхольм, Роўна, Салац, Скровно, Тарваз, Трыкат, Чэствін.

б) Рускае царства губляла горада Полацк і Вяліж са старымі межамі.

в) Рускаму царству вярталіся з усёй маёмасцю і валасцямі гарады, захопленыя Стэфанам Баторыем ва ўладаннях Рускага царства: Вялікія Лукі, Невель, Завалочча, Узгорак.

г) тэрмінам на 10 гадоў спыняліся вайсковыя дзеянні з абодвух бакоў.

д) з дамовы былі выключаны назвы гарадоў Лівоніі, захопленых

Швецыяй (у тым ліку Нарвы), але польскія паслы ў адмысловай заяве прыгадалі пра прэтэнзіі Рэчы Паспалітай на шведскія землі ў Лівоніі. **(4 балы).**

**6.** Падпісаў Ям-Запольскае перамір’е з Іванам IV. Заключыў дамову з магнатамі ВКЛ аб раўнапраўнасці федэрацыі. Ён абавязаўся не прызначаць палякаў гетманамі ВКЛ, склікаць агульныя соймы па чарзе: у Кароне і ў Княстве.

Імкнуўся да ўмацавання каралеўскай улады, вёў змаганне з магнатамі, аказваў падтрымку каталіцкаму духавенству і езуітам у супрацьстаянні рэфармацыйным рухам. Казаў: “Калі б я не быў каралём, быў бы езуітам”.

Пэўны час быў саюзнікам Турцыі, потым браў удзел у стварэнні антытурэцкай лігі. Быў адным з самых рашучых і паспяховых ваенных супернікаў Расіі.

Кароль кіраваў краінай без ведаў моў сваіх падданых (карыстаўся лацінай), рэгулярна дэклараваў сваю асабістую прыхільнасць каталіцызму, а

для ажыццяўлення шматлікіх рэформаў увесь час меў патрэбу ў пісьменных выканаўцах. Такіх людзей яму магла даць толькі эфектыўна працоўная сістэма школ. Яе ён убачыў у езуітаў, якіх актыўна падтрымліваў і адкрываў езуіцкія калегіумы. Падтрымаў езуітаў у імкненні стварыць вышэйшую навучальную ўстанову ў ВКЛ. 1 красавіка 1579 г. выдаў прывілей, паводле якога заснаваны ў 1570 г. у г. Вільні езуіцкі калегіўм ператвараўся ў Акадэмію.

У сувязі з накіраванасцю знешняй палітыкі на ўсход Баторый імкнуўся развіваць інфраструктуру дзяржаўнага кіравання ў межах Вялікага княства Літоўскага, планаваў перанесці сталіцу Рэчы Паспалітай у г. Гродна, дзе перабудаваў каралеўскі замак.

У 1579 годзе спарадкаваў грашовы зварот, усталяваўшы пры гэтым польскі грош галоўным аплатным сродкам.

У часы Стэфана Баторыя ў Вялікім княстве Літоўскім пачаў дзейнічаць Галоўны Літоўскі Трыбунал (1581 г.), які з’яўляўся вышэйшай судовай установай краіны. Гэта быў выбарны суд – ён складаўся з прадстаўнікоў павятовай шляхты, якія выбіраліся на 1 год. Збіраўся Трыбунал два разы ў год на 22 тыдні ў Вільні, Мінску, Навагародку – **(6 балаў).**

**7.** Гэты замак знаходзіцца ў г. Гродна. С. Баторый хацеў перанесці ў г. Гродна сталіцу краіны. Там Стэфан Баторый перабудаваў стары замак Вітаўта, надаў яму барочны выгляд. У цэнтры горада быў пабудаваны для Баторыя палац. На месцы старога драўлянага касцёла (вядомы як Фара Вітаўта) пабудаваў каменны. Кароль вызваліў гарадскія саладоўні і бровары ад падаткаў, дазволіў збудаваць на рацэ Нёман млын, на Рынкавым пляцы – карчму і гандляваць там мёдам, півам, віном без аплаты акцызу. Увесь прыбытак ішоў на патрэбы горада. Таксама кароль даў прывілей на права адкрыцця склада солі ў г. Гродна, якая ў той час была вельмі дарагім задавальненнем. У г. Гродна Стэфан Баторый і памёр. Тут 15 снежня 1586 г. было праведзена анатаміраванне цела Стэфана Баторыя – першае ва Усходняй Еўропе. Кароль пакінуў гораду значную суму грошай. У сваім тастаменце напісаў, каб яго пахавалі ў г. Гродна. Паўтары гады цела Стэфана Баторыя знаходзілася ў г. Гродна, потым яго перавезлі ў г. Кракаў – **(6 балаў).**

**VI. Уважліва паглядзіце на карціны і карыкатуру і адкажыце на пытанні. (Поўны адказ – 67 балаў)**

**1.**



**2.**



**3.**




1. **Якой гістарычнай падзее прысвечаны карціны і карыкатура? Назавіце гады гэтай падзеі? (2 балы)**
2. **Назавіце прычыны гэтай падзеі. (2 балы)**

**3. Якія палітычныя лагеры дзейнічалі напярэдадні і ў ходзе гэтай падзеі? Вызначыце іх пазіцыі і запоўніце табліцу (да 30 балаў)**

| | Палітычныя лагеры | | |
|---|---|---|---|
| | | | |
| Асноўныя палітычныя мэты | | | |
| Асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі | | | |
| Праграмныя патрабаванні па нацыянальным пытанні | | | |
| Праграмныя патрабаванні па аграрным пытанні | | | |
| Сацыяльная база (хто падрымліваў) | | | |

**4. Назавіце падзею, якая адлюстравана на карціне пад нумарам 1. Чаму яна стала знакавай у гісторыі? (2 балы)**
**5. Якая падзея адлюстравана на карціне пад нумарам 2? (2 балы)**
**6. Што адбылося напярэдадні падзеі, адлюстраванай на карціне пад нумарам 2? (2 балы)**
**7. Уважліва паглядзіце на карыкатуру, змешчаную пад нумарам 3 і акажыце на пытанні: (да 27 балаў)**
**а. стварэнню якога органа прысвечана карыкатура? (1 бал)**
**б. прасачыце эвалюцыю змены функцый гэтага органа ўлады. (2 балы)**
**в. колькі скліканняў гэтага органа ўлады было зроблена да кастрычніка 1917 года? (4 балы)**
**г. якія асноўныя пытанні вырашалі на скліканнях гэтага органа ўлады? Якія пазіцыі па асноўных пытаннях жыцця краіны прытрымліваліся прадстаўнікі ад беларускіх губерній? (15 балаў)**
**д. якое значэнне мела для развіцця краіны стварэнне дадзенага органа ўлады? (1 бал)**
**е. выкажыце сваё меркаванне, чаму аўтар карыкатуры пачатку XX ст. менавіта так адлюстраваў гэтую падзею і які сэнс ён укладваў у свой твор? (4 балы)**

**Адказ: Поўны адказ –**

1. Карціны і карыкатура прысвечаны падзеям Першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. **(2 балы).**

2. Прычынам Першай расійскай рэвалюцыі сталі захаванне неабмежаванай манархіі, нyздольнай шляхам рэформаў паслядоўна

вырашыць аграрнае і нацыянальнае пытанні, абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў. **(2 балы).**

3. **Поўны адказ – 30 балаў**

| | Палітычныя лагеры | | |
|---|---|---|---|
| | Манархічна-кансерватыўны | Буржуазна-ліберальны | Рэвалюцыйна-дэмакратычны |
| Асноўныя палітычныя мэты | Захаванне самадзяржаўя – **1 бал** | Усталяванне канстытуцыйнай манархіі з парламента шляхам палітычных і эканамічных рэформ – **1 бал** | Звяржэнне самадзяржаўя усталяванне дэмакратычнай рэспублікі шляхам склікання Устаноўчага сходу – **1 бал** |
| Асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі | Афармляюцца ў другой палове 1905 г.: “Саюз рускага народа”, “Руская манархічная партыя”, “Рускі ўскраінны саюз” – **3 балы** | Афармляюцца ў другой палове 1905 г.: Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя (кадэты), “Саюз 17 кастрычніка” (акцябрысты) – **2 балы** | Бунд, РСДРП (бальшавікі, меншавікі), ПСР (эсэры), БСГ (Беларуская сацыялістычная грамада) – **4 балы** |
| Праграмныя патрабаванні па нацыянальным пытанні | Падтрымка лозунга “адзінай і непадзельнай Расійскай імперыі” – **1 бал** | Увядзенне права нацый на культурнае самавызначэнне. Прызнанне грамадзянскага раўнапраўя усіх народаў Расіі – **2 бал** | Прызнанне права нацый на самавызначэнне – **1 бал** |
| Праграмныя патрабаванні па аграрным пытанні | Захаванне памешчыцкага землеўладання – **1 бал** | Захаванне памешчыцкага землеўладання – **1 бал** | Ліквідацыя памешчыцкага землеўладання, передача ўсёй зямлі ва ўласнасць народа – **2 балы** |
| Сацыяльная база (хто падтрымліваў) | Вышэйшыя ўрадавыя колы, дваранства, манархічная буржуазія, рэакцыйныя памешчыкі – **4 балы** | Асноўная частка буржуазіі, вярхі буржуазнай інтэлігенцыі, памешчыкі, якія абуржуазіліся – **3 балы** | Сялянства, пралетарыят, дэмакратычная інтэлігенцыя – **3 балы** |

4. На карціне пад нумарам 1 адлюстраваны падзеі 9 студзеня 1905 г. Падзеі 9 студзеня 1905 г. на Дварцовай плошчы ў г. Санкт-Пецярбургу, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай “Крывавая нядзеля” сталі пачаткам рэвалюцыі. Тут было расстраляна шматтысячнае мірнае шэсце працоўных, якія накіроўваліся для падачы петыцыі імператару Мікалаю II **(2 балы).**

5. На плошчы каля Віленскага вакзала ў Мінску 18 кастрычніка 1905 г. салдаты адкрылі агонь па 20-тысячным мітынгу працоўных. Ахвярамі сталі каля 100 чалавек, каля 300 было паранена. Гэта падзея атрымала ў гісторыі назву “Курлоўскі расстрэл” ад імя тагачаснага мінскага губернатара П. Р. Курлова **(2 балы).**

6. Напалоханы рэвалюцыйным выбухам, цар Мікалай II быў вымушаны 17 кастрычніка падпісаць Маніфест. У ім упершыню ў расійскай гісторыі цар абяцаў сваім падданым палітычныя свабоды – свабоду слова, сходаў, друку, саюзаў і парламент – Дзяржаўную думу з заканадаўчымі паўнамоцтвамі і правам удзелу ў выбарах усіх пластоў насельніцтва. Маніфест быў сустрэты маёмнымі пластамі грамадства і інтэлігенцыяй з энтузіязмам і надзеямі на палітычныя рэформы. Аднак абяцанае Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. далёка не заўсёды выконвалася **(2 балы)**.

7. **Адказ: Поўны адказ – 27 балаў**.

**а.** Карыкатура прысвечана стварэнню Дзяржаўнай думы ў Расійскай імперыі **(1 бал).**

**б.** 6 жніўня 1905 г. была створана заканарадчая Дзяржаўная Дума, якая атрымала назву Булыгінская. 17 кастрычніка 1905 г. быў выдадзены Маніфест Мікалая II аб надзяленні Дзяржаўнай думе заканадаўчымі паўнамоцтвам **(2 балы).**

**в.** Да кастрычніка 1917 года было склікана 4 Дзяржаўныя думы:

I Дзяржаўная дума – красавік – ліпень 1906 г. **(1 бал)**

II Дзяржаўная дума – люты – 3 чэрвеня 1907 г. **(1 бал)**

III Дзяржаўная дума – лістапад 1907 – чэрвень 1912 г. **(1 бал)**

IV Дзяржаўная дума – 1912–1917 г. **(1 бал).**

**г.** На выбарах у I Дзяржаўную думу перамогу атрымалі кадэты **(1 бал)**. Рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі – эсэры, Бунд, бальшавікі – не прынялі ўдзел у выбарах. Яны спадзяваліся на рэвалюцыйнае скіданне самадзяржаўя **(1 бал)**. У I Дзяржаўнай думе было 36 дэпутатаў ад 5 беларускіх губерняў. Многія дэпутаты ад нацыянальных ускраін утварылі сваю групу – аўтанамістаў **(1 бал)**. У яе ўвайшла ледзь не палова дэпутатаў ад Беларусі, сярод якіх вылучаўся пінскі землеўласнік Раман Скірмунт **(1 бал)**. Гэтыя дэпутаты стаялі на абароне інтарэсаў свайго краю, падкрэслівалі, што ім павінны кіраваць «карэнныя жыхары, а не прышлыя, чужыя і варожыя яму элементы». Аўтанамісты з беларускіх губерняў патрабавалі аднавіць “Літоўскую правінцыю” як спадкаемніцу Вялікага Княства Літоўскага з уласным заканадаўчым соймам і самакіраваннем **(1 бал)**. Галоўным у I Думе было аграрнае пытанне. Большасць сялян – дэпутатаў ад Беларусі не падтрымалі праграму нацыяналізацыі – перадачы зямлі з прыватнай

памешчыцкай уласнасці ў дзяржаўную. Сярод сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі пераважалі погляды, звязаныя з захаваннем прыватнай уласнасці на зямлю **(1 бал)**. У ліпені 1906 г. І Дзяржаўная дума была распушчана па прычыне залішняй, на думку ўрада, рэвалюцыйнасці **(1 бал).**

У час выбараў у ІІ Думу ў заходніх губернях перамаглі манархісты і акцябрысты **(1 бал)**. Адной з самых уплывовых партый стаў Рускі ўскраінны саюз (РУС). Ён дзейнічаў пад лозунгам: “Расія для рускіх, і руския павінны кіраваць ёю”. Яго прадстаўнікі разглядалі Беларусь як частку Заходняй Расіі, адмаўлялі існаванне беларускай нацыі, лічылі неабходным канчатковае зліццё беларусаў з рускім народам **(1 бал)**. ІІ Дзяржаўная дума прапрацавала крыху больш за 3 месяцы. Цар Мікалай ІІ сваім указам ад 3 чэрвеня 1907 г. скасаваў яе. Гэтая падзея лічыцца завяршэннем першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі **(2 балы)**.

ІІІ Дзяржаўная дума праіснавала ўсе пяць адведзеных ёй законам гадоў – з 1907 да 1912 г. **(1 бал).** Новы выбарчы закон 1907 г. значна павялічыў у Думе прадстаўніцтва ад памешчыкаў і буйной буржуазіі, якія падтрымлівалі ўрад **(1 бал).**

Пры правядзенні выбараў у ІV Дзяржаўную думу беларускае насельніцтва было падзелена на курыі (групы): рускую, польскую і яўрэйскую. Беларусаў-праваслаўных запісалі ў рускую, каталікоў – у польскую курыю. Каб аслабіць уплыў польскага дваранства, перавага аддавалася дэпутатам, выбраным ад рускай курыі **(1 бал)**. Ніхто з кандыдатаў ад ліберальных і рэвалюцыйна-дэмакратычных партый у склад дэпутатаў ІV Думы не трапіў **(1 бал).**

**д.** Рашэнне аб скліканні Дзяржаўнай думы, якая надзялялася заканадаўчымі паўнамоцтвамі, стала пачаткам пераўтварэння Расійскай імперыі ў парламенцкую манархію **(1 бал).**

**е.** Можа ўтрымліваць інфармацыю аб тым, што Дзяржаўная дума ўзнікла ў краіне са слабымі дэмакратычнымі традыцыямі. На думку аўтара карыкатуры, дэмакратыя ў Расійскай імперыі падобна на малое дзіця, якое яшчэ не можа хадзіць самастойна і не добра разумее, што і як рабіць. У дзіцячую сукенку апрануты селянін – гэта падкрэслівае тое, што большасць насельніцтва імперыі складаюць сяляне, якія не так даўно былі вызвалены ад прыгонніцтва. Яны не толькі не маюць традыцый парламентарызму, але і ў большасці сваёй непісьменныя **(4 балы).**

**VII. Уважліва паглядзіце на карту і дадайце неабходную інфармацыю. У вялікім квадраце укажыце ў выніку якіх падзей, пагадненняў і г.д. склаліся дадзеныя межы. У малым – гады, калі дадзеныя межы дзяржавы былі актуальныя. (Поўны адказ – 10 балаў)**

<table>
<tr><td>1.<br></td><td>2.<br></td></tr>
<tr><td>3.<br></td><td>4.<br></td></tr>
<tr><td colspan="2">5.<br></td></tr>
</table>

**Адказ:**

**1.** У сакавіку 1924 г. урад СССР выдаў Дэкрэт аб перадачы БССР 16 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў. Гэта ўвайшло ў гісторыю як Першае ўзбуйненне БССР. Даты карты: 1924–1926 гг. **(2 балы).**

**2**. 16 студеня 1919 г. бальшавіцкае кіраўніцтва прымае рашэнне аб далучэнні да РСФСР Віцебскай, Магілеўскай і Смаленскай губерняў ССРБ і аб'яднання савецкіх рэспублік Літвы і Беларусі. 18 сакавіка 1921 г. быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор, па якому значная частка беларускіхзямль адышла да Польшчы. За БССР захавалася толькі 6 паветаў Мінскай губерні. Даты: 1921–1924 гг. **(2 балы).**

**3**. 17 верасня 1939 г. пачаўся паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. 25 верасня войскі Чырвонай Арміі поўнасцю занялі тэрыторыю і

спыніліся на лініі Гродна-Брэст. 28 верасня 1939 г. СССР і Германія заключылі Дагавор аб дружбе і граніцы, паводле якой мяжа была праведзена па так названай “Лініі Керзана” (этнічна мяжа паміж беларусамі і палякамі). 10 кастрычніка 1939 г. Вільня і Віленскі край былі перададзены Літоўскай ССР. 25 лістапада 1940 г. горад Друскенікі перададзены Літоўскай ССР. Даты карты: 1939–1941 гг., 1941–1944 гг. **(2 балы).**

**4**. Снежань 1926 г. у склад БССР адышлі Рэчыцкі і Гомльскі паветы. Гэта ўвайшло ў гісторыю як Другое убуйненне БССР. Даты карты: 1926-1939 гг. **(2 балы).**

**5**. 20 верасня 1944 г. Беласток быў перададзены Польшчы, демаркацы мяжы паміж Польшчай і СССР працягвалася да 1946 (48) гг. Даты карты: 1946 (1948) гг. – па сённяшні час **(2 балы).**

**VIII. Запоўніце табліцу “Судовая сістэма Вялікага княства Літоўскага Рускага і Жамойцкага” і адкажыце на пытанні (Поўны адказ – 34 балы)**

**Па табліцы – кожны правільны адказ – 1 бал**

| Тып суда | Юрысдыкцыя суда | Функцыі суда |
|---|---|---|
| Вялікакняжацкі, суд паноў-рады, соймавы суд | усесаслоўны | справы аб дзяржаўных злачынствах, аб прыналежнасці да шляхецкага саслоўя, скаргах на службовых асоб |
| Камісарскі суд – **1 бал** | Усесаслоўны – **1 бал** | зямельныя спрэчкі паміж феадаламі і дзяржаўнымі маёнткамі |
| Галоўны літоўскі трыбунал | Усесаслоўны | справы па апеляцыйных скаргах – **1 бал** |
| Замкавы або гродскі суд | усесаслоўны (у некаторай ступені) – **1 бал** | справы па абвінавачванню шляхты, мяшчан і сялян – **1 бал** |
| Земскі павятовы суд | Саслоўны | справы князёў, шляхты, баяр павета – **1 бал** |
| Падкаморскі суд – **1 бал** | Саслоўны | справы аб спрэчках паміж феадаламі аб межах землеўладанняў |
| Войтаўска-лаўніцкі суд – **1 бал** | Саслоўны – **1 бал** | справы аб крымінальных злачынствах мяшчан у гарадах з магдэбурскім правам |
| **Копны суд – 1** | Саслоўны | справы простых людзей у вёсцы |

| | | |
|---|---|---|
| **бал** | | на аснове традыцыйнага права |

**1. Назавіце судовыя установы, якія былі выбарнымі (5 балаў)**
**2. Назавіце зборнік законаў, з якога пачалася кадыфікацыя права ў ВКЛ. Што ён уводзіў па ўсёй краіне? (2 балы)**
**3. Як называліся зборнікі законаў ВКЛ. Назавіце даты іх выдання і ахарактарызуйце кожны з іх. Назавіце гістарычных асоб, якія прымалі ўдзел у распрацоўцы кожнага з іх. (15 балаў)**
**4. Да якога часу дзейнічаў на Беларусі адзін са зборнікаў законаў ВКЛ? (2 балы)**
**Адказ:**

1. Галоўны літоўскі трыбунал, замкавы або гродскі суд, земскі павятовы суд, падкаморскі суд, войтаўска-лаўніцкі суд **(5 балаў)**.
2. Судзебнік Казіміра 1468 г. увёў адзіныя пакаранні за аднолькавыя злачынствы на ўсёй краіне **(2 балы).**
3. Зборнікі законаў называліся Статуты: I Статут 1529 г., II Статут 1566 г., III Статут ВКЛ 1588 г. **(3 балы).**

I Статут ВКЛ: ён быў першым у Еўропе зборам законаў у якім утрымліваліся нормы канстытуцыйнага, адміністрацыйнага, шлюбна-сямейнага, грамадзянскага, зямельнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і інш. галін права. У распрацоўцы прымалі удзел канцлер ВКЛ Альбрэхт Гаштольд і першадрукар Францыск Скарына (верагодна). Статут стаў асновай для распрацоўкі II Статута 1566 г. **(3 балы).**

II Статут ВКЛ: Статут 1566 замацаваў асноўныя прынцыпы права: адзінства права для грамадзян, хоць яно не было роўным для ўсіх, дзяржаўны суверэнітэт (насуперак царкоўнаму касмапалітызму), абмежаванне ўлады гаспадара (вялікага князя), прыярытэт пісанага права. Упершыню намячалася аддзяленне суда ад органаў улады і кіравання. Для гэтага ствараліся земскія суды і падкаморскія суды. Больш поўна рэгламентавалася кампетэнцыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання, якія былі заснаваны на агульных прынцыпах феадальнага права: стварэння ільгот і перавага для класа феадалаў і саслоўя шляхты, недапушчэнне простых людзей у органы кіравання, замацаванне прававой няроўнасці розных сацыяльных груп насельніцтва. Складальнікі Статута надалі яго нормам аднастайную і сучасную, на той час, форму і прававую тэрміналогію (беларускую), зразумелую для большасці насельніцтва, што спрыяла ўмацаванню сярод шляхты і мяшчан павагі да закона і дзяржавы. У Статуце быў замацаваны

новы адміністрацыйны падзел ВКЛ паводле рэформы 1565 г. У распрацоўцы прымаў удзел канцлер А. Валовіч **(3 балы).**

III Статут ВКЛ: Трэці статут Вялікага Княства Літоўскага падрыхтаваны на кваліфікаванымі прававедамі пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ А. Б. Валовіча і падканцлера Л. І. Сапегі. У Статут увайшлі нормы дзяржаўнага (канстытуцыйнага) права, чаго на той час не было ў заканадаўчай практыцы іншых еўрапейскіх дзяржаў. Ён абагульніў тагачасныя дзяржаўна-прававыя ідэі, некаторыя з якіх апярэджвалі свой час. У Статуце знайшла адлюстраванне тэорыя падзелу ўлады на заканадаўчую (сойм), выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі) **(3 балы).**

Статут юрыдычна замацаваў фактычную адасобленасць ВКЛ ад Польшчы ў федэрацыйных рамках Рэчы Паспалітай, што працягвалася і пасля падпісання акту Люблінскай уніі. У Статуце акт Люблінскай уніі нават не ўпамінаецца, а ў арт. 4 раздз. замацоўваецца праграма аднаўлення ранейшых граніц княства. Статут прадугледжваў таксама, што атрымліваць маёнткі і займаць духоўныя і дзяржаўныя пасады ў княстве маглі толькі мясцовыя ўраджэнцы і ні ў якім выпадку “чужаземцы”, “загранічнікі” ці “суседзі”. Акрамя правоў і абавязкаў феадалаў і дзяржаўных асоб Статут рэгламентаваў правы і абавязкі простых людзей і прадстаўнікоў этнічных груп (яўрэяў, татар) **(3 балы).**

4. III Статут ВКЛ 1588 г. дзейнічаў у Віцебскай і Магілёўскай губ. – да 1831 г., у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай – да 1840 г. **(2 балы).**